Ніл Гілевіч



...лячуся ласкай
роднае зямлі...

# Шчасьлівая студня

*   *   *

Усе, што гавораць сягоньня
пра лёс беларускае мовы,
дзеляцца на дзьве палавіны:
на тых, каму баліць
і каму не баліць.

Тыя, каму не баліць, —
спакойна зусім
філасофствуюць і разважаюць,
аналізуюць і аргументуюць,
нават пішуць трактаты.

Ну, а тыя, каму баліць,—
у прыступе болю
кідаюцца ніцма на дол

і плачуць надрыўна,
і б’юць кулакамі зямлю...

Вось і ўсё, і ўся розьніца
паміж тымі і тымі.

*2007, травень*

## ТРОЕ МАЛАДЫХ

Ясным,
чыстым ранкам велікодным
у жытло маё, мой церам з кніг,
Завіталі
з добрым словам родным
трое маладых.

Трое, акрылёных сьветлай верай
у Хрыстовы дні.
Трое, не прыгнечаных хімерай
д’яблавай хлусьні.

Што іх прывяло?
Яшчэ з парога
З трох сказаў адзін:
“Ведайце, мы гонару народу
сплюндрыць не дадзім!..”

Хростам сэрца і душы няўгледным
я на гэта бласлаўляю іх –
яснавокіх, гордых, непадлеглых
трое маладых.

*2004-2007*

## МАРАДЗЁРЫ

І ўдзень, і ўначы
марадзёры арудуюць скрозь,
марадзёры!
І сярод белага дня,
на вачах у людзей,
і ў цямрэчы таемна.
Марадзёры –
адвеку вядомае гнюснае племя,
зводу якому няма.

Марадзёры зьдзіраюць
адзеньне й абутак з мёртвых.
Звычайна з палеглых на бойным полі
і яшчэ не зарытых у дол
ваяроў.

Але ў гэтых,
у сёньняшніх нашых,
разьлік адмысловы:
гэтыя з мёртвых
сыноў і дачок Беларусі
зрываюць нацельныя крыжыкі –
амулеты багаславеньня, —
іх веру, іх гонар, іх памяць.
Сарванае – прадаюць:
золата ўсё ж такі!
Ці серабро.
Ну, а хоць бы і медзь...
Гэтым патрэбна пасьпець
душы абрабаваць.

*2006*

## ДАЎНІ ЗАПІС ПРА АРМЕНІЮ

Быў там калісьці –
і запіс зрабіў у нататнічку:
“Божа мой мілы,
як любяць малых у Арменіі!
Мамы і таты,
дзяды і бабулі,
і няні ў садку,
І настаўнікі ў школе,
і ўсё-ўсе суседзі ў двары,
і незнаёмыя цёткі, дзядзькі
на вулцы ці ў скверыку, —
усе да малых прамаўляюць тут
толькі любоўю!
Адною любоўю!
Ды не такою, як мы да сваіх
прамаўляем звычайна –
не нервовай, ня воклічнай,
не павучальнай,
а якойсьці, якойсьці...
ня ведаю, як і сказаць...

галубінагалосай.
Колькі і дзе ні пачуў,
ні падслухаў,—
ну так: галубінагалосай!”

*2007, жнівень*

## САНЕТ БЕЛАРУСКАМУ МЁДУ

*П. У. Вяленку*

Назло ўсім немачам, што пачалі
Усё мацней адольваць з кожным годам,
Назло напасьцям розным і нягодам –
Жыву! Нячысьцікі йшчэ не ўзялі.

Жыву таму, што, як дзіця ў сям’і,
Апекаваны ўсім пчаліным родам,
Штодня лячуся беларускім мёдам –
Лячуся ласкай роднае зямлі.

Цудоўны лек! Любы, хто паспытае, —
Гарчынку знойдзе ў слодычы яго.
Па ёй і цэняць мёд. Але з чаго,
Адкуль бярэцца ў ім гарчынка тая?
Мо з гэных зёлачак, што ў розгар мая
На курганах-капцах цьвітуць штогод?

*2006, сьнежань*

## ГЛЫТОК З ДЗЕДАВАЙ СТУДНІ

Шмат гадоў, вельмі шмат
не прыязджаў я сюды, у Айнаравічы,
у маміну родную вёску,
на вотчыну дзеда.
Што я ўбачыў найперш? Запусьценьне.
Якое кругом запусьценьне!
У двары крапіва ў чалавечы рост.
Не ўзысьці, не прайсьці да ганку.
Хату ўнучкі даўно прадалі
якомусьці міліцыянту пад дачу.
Але ён тут ня летуе,
расчараваўся нібыта
і аб’явіў, даўно ўжо, на продаж.
А ніхто не купляе.
І яна дагнівае.

Двор я пазнаў не па хаце,
а па студні ля вуліцы.
Зруб, той самы, дубовы, счарнелы,
амаль што зраўняўся з зямлёй.
Але стрэшка, пахіленая, ліпіць,
падпёртая збоку слупком.
Ваду яшчэ людзі бяруць,
ды вядра ўжо няма –
таго, адмысловага, “дзеравяннага”,
кожны зачэрпавае сваім,
зачапіўшы дужкай
за жалезны кручок на вяровачцы...

Можа быць, і ў апошні раз
я глынуў з ацалелае студні вады –
і яна азарыла мне ў памяці
маміны згадкі...

Тут, на гэтай сядзібе,
яна нарадзілася і ўзгадавалася,
з гэтай студні піла ад калыскі
крынічную, смачную вельмі ваду.
З гэтай студні ня раз
піў мой бацька, яшчэ дзецюком;
правёўшы да весьнічак Кацю,
сасьмяглы ад жарсьці няўтоленай,
на разьвітаньне казаў:
— Пачакай, я дастану вады,
надта ссохлася ў роце...
— Даставай, толькі ціха,
ня грукні вядром аб ізруб,
а то тата пачуе і выйдзе:
“Каму гэта трэба
калодзеж будзіць апоўначы?!..”

Маміны згадкі.
Шчасьлівыя маміны дні.
Шчасьлівая студня.
Усё яшчэ поіць людзей,
усё яшчэ поіць.
А дзеда ў Айнаравічах
ужо мала хто помніць.

*2007, жнівень*

## МАЎЧАНЬНЕ КАЛЯ ЗАНЯДБАНЫХ МАГІЛ

Зарослая бэзам
магіла бабулі Альжбеты.
А воддаль, за крокаў мо сотню,
другая, таксама зарослая, —
дзеда майго Мікалая.
Тады не было завядзёнкі,
каб побач хаваць.
Хавалі, дзе месца было...

Крыж там і там аднолькавы:
з дзьвюх металёвых труб,
пафарбаваны ў зялёнае,
з маленькай жалезнай
скрыжалькай для подпісу.
А подпісу ўжо і няма –
выцьвіў ад часу, ад сонца, ад сьнегу
і сьцёрся, скрыжалька – сьляпая.

Як ты доўга ня быў тут,
дзедаў і бабін унук!
Што ж цяпер прывяло?
І каго папракнеш за нядбаньне?

Маўчыш.
Доўга стаіш і маўчыш.
Пра такое маўчыш,
Што адно толькі вырвацца крыкам
гатова.
Ды на могілках нельга крычаць.
Тут усё прамаўляецца ціха.

Вось і ты напаўголасу, здушана
кажаш самому сабе:
“Колькі з імі пайшло, адышло
ад твае Беларусі,
што тваёю была!
Што сьвяцілася ў іхніх вачох
і гучала ў іх вуснах!..”
Сёе-тое яшчэ засталося.
У тым ліку і песенька,
якою цябе забаўляла бабуля,
прыстукваючы
кончыкам пальца ў пятку:
“Кую, кую ножку,

паеду ў дарожку.
Дарожка крывая,
кабылка сьляпая.”
Не забылася. Помніцца.
Нават голас, здаецца, чуеш.

Вось і ўсё. І праведаў.
Пабыў ля магіл занядбаных.
“Паедзем,— ківаеш пляменьніку.—
Вернемся ў тое, што ёсьць...”
Ах, дарожка, дарожка,
і чаму ж ты крывая?
Ах, кабылка, кабылка,
і чаму ж ты сьляпая?..

*2007, жнівень*

## АДПУСЬЦІЦЕ

Змучыў сэрца, схваробіў душу –
Даастатку, дарэшты, дашчэнту.
Адпусьціце ж мяне ўжо, прашу.
Для чаго я патрэбен яшчэ тут?

Адпусьціце мяне ўжо да тых,
Што пайшлі – і даўно, і нядаўна,
Што ня здаўшы “сьвятая сьвятых”,
Не зьнікчэмілі род свой бясслаўна.

Адпусьціце да тых, што былі
Мне братамі – і ў полі, і ў хаце,
Бо адну мы, адну на Зямлі
Мелі родную Матухну-Маці.

І кляліся на вернасьць – адной,
І адну шанавалі прасьветла.
І ў падумках ня здрадзілі ёй, —
Годна несьлі свой крыж. Запаветна.

*2007, жнівень*

## ЗГАДКА ПРА ПАЛАНЭЗ

Не перанесьці...
Ня вытрываць...
Сэрца заходзіцца. Млее ў грудзёх.
Сілы, здаецца, пакінуць вось-вось

і пер態нецца дыханьне...
Як жа так сталася?
Як жа так сталася, што без цябе
слухаю гэтую боскую музыку?
Сам. Без цябе.
Тваё крэсла пустуе.
А помню: як трэба было мне,
як мусіў я пераглянуцца з табой,
каб убачыць, як ты
выціраеш хусьцінкаю сьлёзы –
ад шчасьця, што чуеш яе,
гэтую боскую музыку...
У тыя хвіліны
я сам быў бязьмежна шчасьлівы.
І ўдзячны бязьмежна –
Радзіме, Табе і Агінскаму.

*2006-2007*

* * *

Для чаго ты мне іх падарыла –
гады дажываньня?
А гэта мне ты падарыла іх, ты,
толькі ты! Ну, але для чаго?
Для таго, каб мог
яшчэ нешта зрабіць –
трывалей, чалавечней?
Для таго, каб хоць трохі
грахі замаліць перад Богам?
Ці мо ўсё ж для таго,
каб яшчэ і яшчэ раз
я мог прыгадаць,
якой ты шчасьлівай была
у студэнцкія нашы гады!
Раней так выразна
і гэтак балюча
чамусь не прыгадвалася.

*2006-2007*

**ДЗІЎНАЕ ШТОСЬ**

З нейкага часу,
дакладна ня помню,
ужо даўнавата, —

як пачала набліжацца ізноў,
у чацьверты ўжо раз,
самая горкая,
самая страшная,
самая чорная дата –
дзень, калі ў сэрцы маім
і апошні праменьчык пагас, —

дзіўнае штось
адчуваю я ўсёю істотаю
з лёсам нязгоднай:
быццам зусім
не да сумных угодкаў тваіх
трэба ладзіцца мне –
не да прывычнага ўжо
пакланеньня магілачцы роднай,
а да чагосьці такога,
што толькі здараецца ў сьне.

Быццам бы, быццам, нарэшце,
і скончыцца наша расстаньне-разлука.
Скончыцца гэтая
наканаваная мне
неадкупная мука.

*2007, ліпень*

* * *

Калі, дасьць Бог, для памяці тваёй
яшчэ зраблю я тое, што хачу –
бяз крыўд сыду на вечны супакой
і перад лікам Маці Прасьвятой
апошні раз удзячна памаўчу.

*2007, жнівень*